Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 14 Вільня, Нядзеля 10 Красавіка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

З нагоды сьмерці Пінскага р.-к. Біскупа З. Лазінскага.

26 сакавіка сёл. г., пасьля цяжкой опэрацыі, памёр біскуп Пінскай каталіцкай дыэцэзіі З. Лазінскі.

Нябошчык адзначаўся сьвятасьцяй жыцьця, меў адвагу заўсёды сказаць праўду ў вочы сільным гэтага сьвету, быў поўны апостальскага духа і любові да Хрыстовай Праўды, а так-жа сьветлы і глыбока адукаваны.

Паходзіў з Наваградзкай беларускай спольшчанай шляхты, лічыў сябе паляком, працаваў у Петраградзе, як прафэсар Дух. Сэмінарыі і Дух. Акадэміі, а пасьля вайны некаторы час у Менску, як біскуп і ўрэшце ў новаарганізаванай дыэцэзіі Пінскай, якая абыймае беларускія землі Наваградчыны і беларуска-украінскія—Піншчыны.

Словам, працаваў сьв. п. кс. Лазінскі, асабліва будучы біскупам Пінскім, пераважна сярод беларусаў. Дык дарэчы тут будзе запытацца, як-жа ён да беларусаў адносіўся? Вось-жа будучы біскупам у Менску біскуп Лазінскі адносіўся да беларусаў прыхільна. Ён напр. ня толькі дазваляў гаварыць беларускія казаньні, але 6.XII.1918 г. сам сказаў казаньне пабеларуску ў Менскай Катэдры. Ад гэтага часу ў Менску ў капліцы Дабрачыннасьці стала былі беларускія казаньні і пяяў беларускі касьцельны хор, аж покуль там не ўкараніліся бальшавікі і не замарозілі беларускага рэлігійнага жыцьця.

Пасьля Рыскага міру ў 1921 г., калі пры падзеле Беларусі між Саветамі і Польшчай частка Менскай дыэцэзіі адышла да Польшчы, біскуп Лазінскі, ня могучы сам далей аставацца, пакінуў Менск і асеў у Наваградку. Урэшце ў 1925 г. арганізаваў з успомненых беларускіх і беларуска-украінскіх зямель Пінскую дыэцэзію, якой і быў назначаны біскупам з сядзібай у Пінску.

Ад гэтага часу адносіны сьв. п. біскупа Лазінскага да беларусаў пагоршалі. Нябошчык ужо заяўляў, што беларусы каталікі гэта бадай арганічная частка польскага народу, што ім думаць аб сваім адраджэньні няма ані патрэбы, ані нават права і што вучыць іх веры Хрыстовай з прынцыпу трэба папольску. Свайго гэткага пагляду нябошчык бараніў стойка. Ён нават ня спыняўся прад тым, каб беларускіх ксяндзоў, якія рвуцца да беларускай каталіцкай працы, высылаць на парафіі небеларускія. Для прыкладу ўспомнім кс. кс. Татарыновіча і Дуліца. Просьбы многіх ягоных дыэцэзьян, як з парафіяў: Новая-Мыш, Ляхавічы, Мядзьведзічы і інш., каб ім дзеля лепшага разуменьня Слова Божага было ўведзена беларускае казаньне, так-жа ня былі споўнены.

Сьв. п. біскуп Лазінскі быў выдатным дзеячом на ніве рэлігійнага спалучэньня беларусаў каталікоў і праваслаўных. Дзякуючы ягоным захадам у ягонай дыэцэзіі паўстала некалькі уніяцкіх парафіяў. Вось-жа нябошчык у гэтых парафіях агулам дазваляў гаварыць беларускія казаньні, якія там па сяньняшні дзень сапраўды гавораццa.

Агулам аднак трэба сказаць, што як да справы беларускага народнага адраджэньня, так і да такога адраджэньня сваіх дыэцэзыянаў беларусаў, сьв. п. біскуп Лазінскі прыняцьпова апошнім часам адносіўся няпрыхільна. Справы гэтай ён недалюбліваў, а можа не разумеў. Адносіны яго да беларускай справы — гэта адносіны польскага шляхціца з мінулага стагодзьдзя. У сваім пастырскім лісьце, які ў тэстамэнце свaім прасіў адчытаць на ягоных паховінах у касьцеле, моляччыся за сваю Айчыну, а так-жа за суседнія краіны: „за Літву, за Латвію, за Русь і Расею“, ён ня мог аднак адважыцца Беларусь назваць ейным імёньнем.

Гэткі пагляд бкп. Лазінскага як на правы беларусаў каталікоў да сваей мовы ў іх касьцельным жыцьці і агулам гэткія ягоныя адносіны да справы адраджэньня беларускага народу, мы, беларусы, уважаем за старонныя, няслушныя і несправядлівыя. Мы ўважаем, што з прынцыпу гаварыць трэба да беларусаў каталікоў казаньні не папольску, а пабеларуску. Гэтак, уважаем, павінен быў паступаць нябошчык і ў сваей дыэцэзіі, бо за малымі выняткамі наплывовага элемэнту і кучкі мясцовых паноў, уся дыэцэзія Пінская (адкінуўшы ўкраінцаў) — беларуская.

Мы так-жа ўважаем, што адраджэньне кожнага народу ёсьць ня толькі ў згодзе з думкай Хрыста і Касьцёла, але ёсьць нават іх натуральнай вымогай.

Аднак за зло біск. Лазінскаму гэткіх да нас старонных адносінаў ня маем, бо верым, што адносіны гэныя паходзілі з добрай волі ягонай, гэткімі былі пагляды і праканаваньні нябошчыка. Ён гэтак лучыў ідэалы Хрыстовы прадусім з польскімі. Мы лучым ідэалы Хрыстовы прадусім з беларускімі, дык ясна, што ў гэтым пагляд маем ад ягонага адменны.

Дык клонячы галаву прад сьв. п. біскупам Лазінскім, як выдатным, ідэйным і стойкім — у сваім разуменьні — Апосталам Хрыстовым, адначасна бяром яго сабе за прыклад у змаганьні за дапушчэньне праз родную мову ў жыцьці касьцельным і праз народнае адраджэньне больш сьвятла Хрыстовага, больш праўды і справядлівасьці для нашага народу ў разуменьні нашым, беларускім.

На заканчэньне астаецца толькі выразіць дасьпелае ўжо ў беларускай грамадзкай думцы пажаданьне, каб Апостальская Сталіца, назначаючы ў Пінскую дыэцэзію новага біскупа, не забылася, што там прагнётаючая большасьць беларусаў і што належыцца ім біскуп беларус, які быў-бы не чужаніцам, не казённым выканаўцам сваіх абавязкаў, але праўдзівым пастырам.

Як жа насьпеў ужо час на гэта!...

Народнае сьвята.

(25 III.1918—25.III.1932).

Беларускае грамадзянства ад 1918 г. з году ў год дзень 25 сакавіка сьвяткуе з вялікай урачыстасьцяй. За прыкладам мінулых гадоў і сёлета 25 сакавіка — дзень Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, беларусы належна адсьвяткавалі.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, як найвышэйшая нац.-беларуская інстытуцыя ў Зах. Беларусі, абымаючая ўсё арганізаванае беларускае грамадзянства пад Польшчай — на сваім агульным сходзе дня 13.III с. г. выдаў адозву да ўсіх беларускіх арганізаваных асяродкаў з заклікам належна ўспомніць у дзень 25 сакавіка аб значэньні для Беларускага Народу Акту Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 III 1918 г. У Вільні сьвяткаваньне 14-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Б.Н.Р., з прычыны Вялікай Пятніцы ў каталікоў, агульны сход Нац. К-ту пастанавіў перанесьці на другі дзень — на панядзелак ураджайнага паседжаньня Нацыянальнага Камітэту. Згодна з гэтай пастановай Прэзыдыюм Б.Н.К-ту дня 25 сакавіка наладзіў урачыстае паседжаньне К-ту, на якім старшыня К-ту грам. Пазьняк сказаў кароткую адпаведную да ўрачыстасьці прамову і была прынята рэзалюцыя наступнага зьместу:

Беларускі Нацыянальны Камітэт, як усебеларускае нацыянальнае прадстаўніцтва зах.-беларускіх земляў, на ўрачыстым сваім паседжаньні дня 25 III.32 г., з прычыны 14-тых угодкаў акту 25.III.1918 г. аб Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, разважыўшы ўнутраныя і вонкавыя чыньнікі, якія прывялі Беларускі Народ да гэтага акту, зложаныя ахвяры, а таксама прычыны, якія сталі і дагэтуль стаяць на перашкодзе да ягонага зьдзейсьненьня, — пакланяецца ахвярам нязломнага змаганьня і сьцьвярджае адзіна-правільны дагэтуляшні свой незалежніцкі шлях барацьбы за вызваленьне Беларускага Народу, шлях самасільны, шлях гістарычны, вольны ад усякіх уплываў як Усходу, так і Захаду.

Гэта маючы наўвеце Б.Н.К-т заклікае ўсё бел. грамадзянства стаяць пры ім цесна і на далей у цьвёрдай веры і пераканаваньні, што права да жыцьця для жывога Народу пачутым і прызнаным быць мусіць.

Раней ці пазьней, праўда і справядлівасьць пераможа!

У гэты дзень Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту атрымаў многа пісем і тэлеграмаў, паміж іншым: ад Беларускага Нацыянальнага Камітэту заграніцай, ад Беларускай Рады ў Праэе Чэскай, прывітаньне старшыні Літоўскага К-ту ў Вільні К. Сташыса, які ў тэлеграме з Рыгі (Латвія) ад імя К-ту выражае сардэчнае пажаданьне зьдзейсьненьня вялікага ідэалу Беларускага народу.—Адтрыманы таксама рад пісьмаў з прывітаньнямі з краю.

Сьвяткаваньне на эміграцыі.

Нас паведамляюць з Чэхаславаччыны, што там, у Празе Беларуская Рада 25 сакавіка с. г. у 14-ыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Б.Н.Р. наладзіла сьвяткаваньне ў наступным парадку: — Уступнае слова да прысутных сказаў старшыня сходу, намесьнік старшыні Рады Б.Н.Р. В. Захарка, а рэфэрат на тэму: „Ідэйныя мэты — імкненьні беларускага вызвольна — адраджэнскага руху“ — прачытаў др. Т. Грыб.

Сьвяткаваньне ў Віленскім засьценку беларускіх угадоўцаў.

Сьвяткавала гэтае вялікае народнае сьвята — сьвята незалежнасьці Беларускага Народу і мяшчанская група віленскіх беларускіх угадоўцаў, якая называе свой кагалік „Цэнтрасаюзам". Гэная група, за сваю ўгадовасьць маючы падтрыманьне ў сільных сяньняшніх дзён, ня маючы за гэта ніякіх уплываў на беларускія масы і ніякага адтуль падтрыманьня, мае „магчымасьць" уступу і ў Віл. Бел. гімназію.

Вось-жа і ў гэты Вялікі дзень для беларусаў „нашы" ўгадоўцы скарысталі з гэтай „магчымасьці" і нападзілі паседжаньне „Цэнтрасаюзу" ў гімназіяльнай залі, дзе прад сагнанымі вучнямі прачытаў свой палітычны рэфэрат „ідэолёг" найнавейшай санацыйнай беларуска-польскай угоды — „бялорусін-поляк" Антоні Луцкевіч.

n.

Украінскі народны зьезд.

Дня 25 і 26 сакавіка сёл. г. у Львове адбыўся зьезд Украінскага Нацыянальна-Дэмократычнага Аб'еднаньня (УНДО), на які зьехалася каля 200 дэлегатаў.

Зьезд адбываў нарады праз два дні і пасьля нарадаў, у поўнай згодзе ўчасьнікаў зьезду, прыняў рэзалюцыі — з каторых 3 рэзалюцыі скантфіскаваны — і выбраў новы цэнтральны камітэт УНДА.

У Цэнтральны к-т УНДО выбраны др. Д. Левіцкі, др. В. Загайкевіч, а. прапат Л. Куніцкі, др. Л. Макарушка, В. Мудрый, Д. Паліів, Мілена Рудніцкая. В. Цэлевіч і інш.

Дзеля прывітаньня братняга ўкраінскага народу ад беларусаў быў на гэтым зьездзе віцэ-старшыня Беларускага Нацыянальнага К-ту пасол Ф. Ярэміч.

Украінскае Нацыянальна-Дэмократычнае Аб'еднаньне (УНДО) — гэта арганізацыя аб'еднываючая ўсе ўкраінскія палітычна-грамадзкія групы, апрача ўгадоўцаў — полёнофілаў і камуністаў.

Словам, як Беларускі Нацыянальны Камітэт у беларусаў, так УНДО ў украінцаў — гэта народная рэпрэзэнтацыя, якая, трымаючы вызвольна-народны сьцяг, кіруе народна-палітычным жыцьцём у напрамку да зьдзейсьненьня вялікага народна-незалежніцкага ідэалу.

Пры гэтым трэба адзначыць, што апошні зьезд УНДО яшчэ раз пацьвердзіў стойкасьць украінскага народу на занятай пазыцыі і зразуменьне народнай моцы ў аб'еднаньні. Аб гэтым сьведчаць прынятыя на зьезьдзе рэзалюцыі, апублікаваныя ў украінскай прэсе і поўная згода ўчасьнікаў зьезду на працу ў аб'еднаньні.

b.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!"

З беларускага жыцьця.

Агульны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры адбудзецца ў нядзелю дня 24 г. м. а гадз. 16 у памешканьні ўласным, у Вільні, пры вул. Людвісарскай 1—19. На парадку дня справаздача з працы за мінулы год, намечаньне пляну працы на будучыню, перавыбары і бягучыя справы. Прысутнасьць усіх сяброў Рады і дэлегатаў абавязкавая. У разе нястачы кворума на гадз. 16-ую, сход на адну гадзіну пазьней, гэта знача а гадз. 17-ай таго самага дня будзе правамоцным пры ўсякім ліку прысутных.

І міністэрства адмовілася ад зацьверджаньня арганізацыі бел.моладзі. Віленская беларуская моладзь зрабіла ў 1930 годзе належныя крокі дзеля заснаваньня свайго асобнага таварыства „Будучыня", якое ставіла сабе мэты культурна-прасьветныя і выхаваўчыя. У Віленскім ваяводзтве зацьвердзіць гэтае т-ва адмовіліся. Тады закладчыкі т-ва „Будучыня" зьвярнуліся з рэкурсам у Міністэрства Унутраных Спраў у Варшаву, скуль анагдай праз Віленскае ваяводзтва прышоў адказ таксама адмоўны і без паданьня праўных довадаў. І выходзіць так, што паводле пісаных польскіх законаў, беларусы пад Польшчай маюць усе магчымасьці нацыянальнага разьвіцьця, а ў сапраўднасьці — нават найвышэйшыя ўлады не даюць дазволу на легальныя, культурна-прасьветныя і выхаваўчыя арганізацыі беларускай моладзі. І гэта ў той час, калі вёскі нашыя заліваюцца рознымі польскімі „коламі," „зьвёзкамі," „стшэльцамі" і ім падобнымі„ лавушкамі," якія закладаюцца для несьвядомай беларускай моладзі, а беларусам вечна закідаецца „брак культуры і арганізацыі." Тым часам „культуры" гэтай неадкуль здабыць, бо для дзяцей беларускіх не даецца беларускай школы, а бел. моладзі—не даецца магчымасьці нават заснаваць сваю арганізацыю.

Мэта польскіх урадавых кругоў пры гэтым цалком зразумелая... Беларуская моладзь хіба-ж ня дасца так лёгка зьнеахвоціцца стаўлянымі ёй труднасьцямі і справу свае арганізацыі пастараецца павесьці далей. Да гэтага мае ня толькі права, але і абавязак.

Набажэнства для беларусаў-каталікоў у касьцеле сьв. Мікалая (Вільня, завул. сьв. Мікалая 8) пасьля Вялікоднага перарыву, з прычыны фэрыяў у мясцовых беларускіх школах, узноў пачалося ў мінулую Праводную нядзелю 3 гэт. мес. і на будучыню будзе стала адпраўляцца што нядзелю і сьвята а 10-ай гадзіне рана. Падчас набажэнства пяюцца беларускія рэлігійныя песьні і гаворыцца беларускае казаньне.

Абавязкам кожнага беларуса-каталіка ёсьць ня толькі самому быць на беларускім набажэнстве, але прывадзіць на яго і сваіх знаёмых, каб супольна мацаваць душу малітвай ў роднай беларускай мове.

Сьмерць. У суботу 26 м. м. памярла ў Віленскім шпіталі п. Марыя Ільяшэвіч, матка вучыцеля Віленскай Беларускай Гімназіі Д-ра М. Ільяшэвіча.—На гэтым месцы выражаем грам-ну М. Ільшэвічу і ўсёй асірочанай сям'і слова шчырага спагаданьня.

Гурток Б. І. Г. і К. саргаізаваўся ў в. Харкі, Пастаўскага павету.

З выдавецкай нівы. Вышаў ужо № 3 (38) **„Шляху Моладзі."** Зьмест: 1. Адраджэньне-Незалежнасьць; 2. Прычыны уніі Беларуска-Літоўскай Дзяржавы з Польшчай; 3. Аб культурных формах жыцьця; 4. Літэратура; 5. Як быць здаровым; 6. Жывая прырода: Гасп. свойская жывёла—скаціна; 7. Лісты; 8. Хроніка; 9. Усячына; 10. Наша пошта.—Цана нумару толькі 30 гр. Падпіска на год 2 зл. Адрэс: Вільня Завальная 6—10.

— Вышаў з друку таксама „Дадатак да каталёгу бел. кнігарні „Пагоня," Вільня, Завальная 6 10.

З Польшчы.

Касьцельны падатак. Польскія газэты падаюць, што незадоўга будзе аб'яўлены закон аб касьцельных падатках, паводле якога каталікі будуць плаціць падаткі на касьцёл асобна. Закон гэты будзе абавязваць ад 1934 г.

Касьцельны падатак будуць плаціць усе каталікі запісаныя ў парахвіяльныя кнігі, каторыя плацяць хоць адзін з галоўных беспасярэдны дзяржаўных падаткаў: — дахадовы, грунтовы, ад нярухомасьці і тыя, што выкупляюць прамысловыя патэнты. Падатак гэны дзеліцца на звычайныя і надзвычайныя складкі. Першы ня можа быць большы як 5 працант. ад сумы дзяржаўнага падатку, плачанага падатнікам у папярэднім годзе.

Складкі гэныя пастанаўляе плаціць парахвіяльная рада зложаная з 6—15 асоб. Парахвіяльную раду выбіраюць каталікі, каторыя кончылі 24 гады і плацяць хоць адзін з беспасярэдны дзяржаўных падаткаў. Сабраньне дзеля выбараў парахв. рады склікае пробашч. Для важнасьці выбараў не прадбачана „кворуму" адносна колькасьці прысутных на сходзе. У парахв. раду ня можа быць выбрана асоба „ведамая з растратнасьці маемасьці і паганых звычаяў". Гэныя складкі сьцягвае і імі распараджаецца парахв. рада.

Вось так менш-больш выглядае закон аб новых падатках на касьцёл.

Забастоўка вуглякопаў заламалася. У Кракаўскіх і Дамброўскіх капальнях забастоўка вуглякопаў ужо зьліквідавалася. Забастоўка зьліквідавалася не на падставах якога-небудзь паразуменьня, а проста заламаўся забастовачны дух. Такім чынам няўдача гэтай забастоўкі, поруч з няўдачай генэральнай дэманстрацыйнай забастоўкі 16.III. с. г., гэта паважны ўдар для польскіх прафэсіянальных работніцкіх саюзаў і кіруючых гэтымі саюзамі палітычных партыяў, асабліва для П.П.С.

W. A.

9)

Kaniok-Harbuniok.

III.

Pryjšła zhuba ciomnaj nočy:
Sonca lezie joj u wočy;
Dzień śmiajecca, noč bladnieje;
Świet zbudziŭsia. Dnieje, dnieje!
Piajuć ptuški. Świet pryhožy
Piaje, chwalić Ohlad Božy.
Spalnik tak-ža prabudziŭsia;
Na świet hlanuŭ, až ździwiŭsia,
Što tak świetła, tak pryhoža.
Choča wyleści — nia moža!
Lezie z skryni cicha, cicha...
Dy awios šuršyć jak licha.
Tolki-ž Janka śpić, nia čuje.
Spalnik nowy plany snuje:
Da raboty sprytna ŭziaŭsia —
Až da Janački zakraŭsia,
Ciahnie šapku, z šapki—stužki,
Dyj schwaciŭ piaro Žar-ptuški!...
Tady spalnik, brat ty moj,
Ŭziaŭ i piaty za saboj.
Kniaź ustaŭ, biarecca jeści;
Až tut spalnik niasie wieści;
Tak i tak pra Janku kaža,
Na kancy piaro pakaža.
I jak staŭ jamu wywodzić
Pleści, łhać i waławodzić...—
I što Janka čaradziej,
Horšy ad usich ludziej;
Što jon niechryść i pahaniec,
Warażbit i ašukaniec.
Kniaź toj słuchaŭ, słuchaŭ, słuchaŭ
Až pa łysinie pačuchaŭ.
Spalnik niska pakłaniŭsia,
Ŭ try pahibieli skruciŭsia;
Piaro z pazuchi dastaŭ,
Kniaziu wietliwa padaŭ;
Piać pakłonaŭ pryłažyŭ
I sam sprytna adstupiŭ.
Kniaź hladzieŭ i dziwawaŭsia,
Kruciŭ wusy i śmiajaŭsia;
Dy nia wiedaŭ, čyja siła
Tut była, što tak świaciła?
Tym piarom kruciŭ, kruciŭ,
Pośle končyk adkusiŭ...
Prykazaŭ piaro schawaci
Pad zamok i pad piačaci.
Pośle kryknuŭ na dwaran,
Kab šukali, hdzie Iwan.
Jany kinuliś paśpiešna...
Było kniaziu wielmi śmiešna,
Jak dwaranie u dźwiarach
Druh ab druha trach—tarach!
Nos pa nosie, łeb pa łebie...
Pakazaliś zorki ŭ niebie,
Ślozy stali u wačach,
Jak dwaranie pry dźwiarach
Biehli, pali, palahli,
Dyj padniacca nie mahli.
Pośle ŭstali skokam-bokam,
To zapraŭdy, to narokam;
Sabie cichańka mirhajuć,
To latuć, a to kulhajuć,
Za saboju ciahnuć klušni
I paŭzuć až da kaniušni.
Woś prybiehli, adčynili,
Dyj sadomu narabili...
Jak ŭzialisia — nie marudziać,
Kryčać, nudziać, Janku budziać,
Zapraŭdy i dla zabaŭki —
Jon chrapić na ŭsie zastaŭki.
Pośle stali ščykataci,
Ciahać Janku pa toj chacie,
A jon śpić spakojna, roŭna,
U hrudziach pawietra poŭna;
Son pawažny, smačny, płaŭki —
Jon chrapić na ŭsie zastaŭki.
Pośle Janku jak absieli,
Bili, drali, jak chacieli.
Cełу dwor siudy sabraŭsia,
Ale Janka nie dawaŭsia:
Śnić pra hadziny, wužaŭki
I chrapić na ŭsie zastaŭki.
Śpić, sapie, chrapić, marmoča—
Ustawać saŭsim nia choča.
Tak naš Janka spaŭ i spaŭ,
Pośle ŭziaŭ i sam ustaŭ.
„A was tut čaho nahnała?
Što, wam, kaža, zamku mała —
Siudy lezicie kutom?
Jak padmažu was knutom,
Dyk papomnicia na wiek,
Što Iwan za caławiek!"
„Nia kryčy, z barłohu złaź,
Bo wun kliča ciabie kniaź"
„Kniaź?...Nu, dobra! Prybiarusia
Zara kniaziu pakažusia."
Tak kazaŭ pasłom Iwan.
Zara wyciahnuŭ kaptan,
Pojas, šapku, nowy boty;
Tolki što nia braŭ kapoty.
Tak źbiraŭsia, doŭha myŭsia,
Daŭžej pośle charašyŭsia —
Prajšło moža try minuty,
Byŭ hatowy i abuty.

(d. b.)

З заграніцы.

Змаганьне за ўплывы ў сярэдняй Эўропе. Змаганьне за ўплывы ў сярэдняй Эўропе было адной з галоўных прычын сусьветнай вайны. Стварэньне палітычна-гаспадарчага блёку сярэдня-эўрапэйскіх дзяржаў было галоўнай мэтай заграпічнай палітыкі праваеннай Нямеччыны. Пераможаная ў сусьветнай вайне Нямеччына не змагла зрэалізаваць гэтага пляну, але ідэя стварэньня такога блёку асталася жывой.

Спроба рэалізацыі гэтага пляну ў форме аўстрыйска- нямецкага мытнага саюзу няк так даўна нарабіла ў Эўропе многа шуму. Асабліва заварушылася Францыя і справа апынулася аж у Гаскім Міжнародным Трыбунале, каб не дапусьціць да злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай і гэтым адгарадзіць Нямеччыну ад уплываў на сярэдня-эўрапэйскія дзяржавы. Гасгі Трыбунал, як і заўсёды, выдаў у гэтай справе саламонаўскі прысуд, а імена: — Аўстрыя з Нямеччынай мытны саюз заключыць нібы можа і нібы ня можа. Але Аўстрыя, пад фінансавым націскам Францыі, ад заключэньня з Нямеччынай мытнага саюзу пакульшто адмовілася.

Тады Францыя, разумеючы, што зблізкэньне Аўстрыі з Нямеччынай — гэта прыродная канечнасьць, і каб адгарадзіць уплывы Нямеччыны на дзяржавы сярэдняй Эўропы, пастанавіла сама стварыць гэтак зв. наддунайскую фэдэрацыю сярэдня эўрапэйскіх дзяржаў, ды йграць у ёй першую скрыпку.

Але, як плян аўстрыйска-нямецкага мытнага саюзу спаткаўся з рашучымі спраціўленьнямі, галоўна з боку Францыі, а также і Італіі, так і цяперашні францускі плян наддунайскай фэдэрацыі натрапіў на вялікія перашкоды з боку Нямеччыны і Італіі.

Францыя, у імкненьні да рэалізацыі гэтага свайго пляну, парушыла ўсе спружыны свайго дыпляматычнага апарату і ўжо дабілася таго, што ў Лёндане (Англія), у палавіне гэтага месяца маецца адбыцца нарада ў гэтай справе прадстаўнікоў чатырох дзяржаў: — Францыі, Англіі, Нямеччыны і Італіі.

Як далей Францыя будзе разьвіваць сваю палітыку ў імкненьні да рэалізацыі гэтага пляну, пакажа будучыня, але пачатак дык адразу Польшчу пакінуў у цяньку, бо ў дасюлешніх кроках францускай палітыкі адносна стварэньня наддунайскай фэдэрацыі Польшча ня бралася пад увагу. А трэба ведаць, што стварэньнем гэтай фэдэрацыі ў вялікай меры зачэпліваюцца інтарэсы Польшчы.

Вайна, мір і п'яная камісія Лігі Народаў на Далёкім Усходзе. Японія, распраўіўшыся аружжам з кітайцамі, заняўшы Манджурыю і стварыўшы для сябе манджурскую „дзяржаву," згадзілася з кітайцамі на перамір'е, а Ліга Народаў, каб пасьля гэтага „памірыць" Кітай з Японіяй, выслала туды сваю камісію, якая мае ўсё прасьледзіць, аб усім даведацца і тады Ліга ўжо скажа сваё „важнае" слова ў гэтай справе і мае „памірыць" японцаў з кітайцамі.

Сьпярша гэта камісія, каб „належна" абсьледзіць японска-кітайскі канфлікт і аб усім даведацца, цэлы тыдзень балявала на банкетах у японцаў, а цяпер гуляе на банкетах у Пэкіне і Нанкіне з кітайцамі. Газэты падаюць, што сам старшыня камісіі вельмі змучыўся надмернымі абедамі і азіяцкімі цэрэмоніямі, а адзін сябра камісіі дык пераехаўся —аж захварэў .А тымчасам кітайцы з японцамі самі гавораць аб міры. Можна спадзявацца, што пакуль эўрапэйскія „міратворцы" прыдуць да сябе пасьля японскіх ды кітайскіх банкетаў, Японія з Кітайчынай самі паміракцца, бо Японія падгатаўляе такі-ж канфлікт і з бальшавікамі.

Газэты падаюць, што Японія і Саветы гатуюцца да вайны: сьцягваюць да граніцы войска і амуніцыю. У Манджурыі перакананы, што вайна Японіі з бальшавікамі немінучая. Бальшавікі ў Уладывастоку магазынуюць правіянт для войска.

Забурэньні ў С.С.Р.Р. і хвароба Сталіна. Апошнімі днямі ў Маскве і Ленінградзе (Пэтраград) пачаліся забурэньні галодных. Галодная таўпа людзей нападае на склады прадуктаў першай патрэбы, галоўна дзе ёсьць што зьесьці, разьбівае і грабіць.

Апрача гэтае непаслухмянасьці ўлады з боку галоднага натоўпу, бальшавікі апынуліся ў трывозе і за жыцьцём свайго дыктатара Сталіна, які моцна хворы на невылячымую хваробу — рака. Каб ратаваць ад сьмерці Сталіна, камуністы выпісалі з заграніцы, галоўна з Нямеччыны, найвыдатнейшых дахтароў.

На Каўказе вёскі бяз людзей. Пасьля васеньняга адбіраньня ў сялян „лішніх" запасаў хлеба, многія каўкаскія вёскі праз доўгі час не плацілі ніякіх падаткаў. Камуністычная ўлада, каб змусіць тамашніх сялян аддаць апошнее ў бальшавіцкую казну, выслала ў гэтыя вёскі экзэкуцыйныя атрады, якія, прыехаўшы на мейсца, знайшлі вёскі засыпаныя сьнегам, а ў вёсцы — ані жывой душы. Куды сяляне паўцякалі з вёсак — няма ведама.

Забойства камісара паліцыі. Дня 22.III с. г. у Львове няйзоўленыя дагэтуль забойцы застрэлілі ў белы дзень сярод вуліцы камісара паліцыйнай паліцыі Чэхоўскага. Газэты падаюць, што Чэхоўскі меўся праводзіць сьледзтва аб забойстве Голувкі і спадзяваўся выкрыць віноўнікаў забойства. Хто забіў Чэхоўскага і ўпярод Голувку—так і астаецца пакульшто сакрэтам. Можа калі і высьвятліцца гэтая тайніца забойстваў.

Безрабоцьце ўсё расьце. Паводле ўрадавага абліченьня ў мінулым тыдні было 355.970 беззработных. Да гэтай лічбы гэтымі днямі прыбавілася 1400 беззработных у Дамбровскіх капальнях вугля, каторым адмовілі там працу ад дня 1 г. м. Апрача гэтага, дабаўляецца беззработных і з азотнай фабрыкі ў Хожаве, якая спыняе сваю дзейнасьць.

Кароткія навіны.

— З Савецкай Украіны ў мін. годзе ўцякло праз граніцу ў Румынію 324 сям'і, а сёлета—ужо 359 сем'яў. Бальшавіцкая пагранічная варта страляе ўцякачоў, як зайцаў і кідае ў іх бомбамі. Гэтак многа забіваюць. Часта перабягаюць праз граніцу маткі з забітымі ад куляў у дарозе малымі дзяцьмі на руках.

— У Гішпаніі арыштавалі аднаго камуніста, у каторага знайшлі дакуманты, якія паказваюць, што камуністычны рух у Гішпаніі фінансавала Масква.

— Троцкі падаў у газэты, што ён спадзяецца перамены ў СССР і выразіў гатоўнасьць тады вярнуцца ў Расею ды ўзяць у свае рукі ўладу.

— У Эўропе ў год прыбывае 3 мільёны людзей.

— Безрабоцьце ў Польшчы за тыдзень пабольшала на 2054 асобы.

— На падставе апошняга сьпісу насельніцтва сьцьверджана, што ў Польшчы людзі пераважна жывуць да 50 гадоў. У Францыі пераважны век людзей вышшы на 3—15 проц. Таксама і ў Нямеччыне. Гэта паясьняецца тым, што ў Францыі і Нямеччыне лепшыя гігіенічныя варункі і вышэйшы культурны ровень насельніцтва.

— У Здунскай Волі, каля Варшавы селянін Петшыкоўскі прадаў на кірмашы сына за 50 зл. Хлопца купіў так-жа селянін з дагаворам, што калі хлапчук будзе добры, дык за два гады даплаціць яшчэ 50 пудоў жыта. Прадажа не дайшла да скутку, бо перашкодзіла паліцыя.

— Амэрыканскі сэнатар Бэра сказаў у прамове, што няма гутаркі аб сапраўдным разбраеньні, пакуль не скасуюць Вэрсальскага трактату, які абапёрты на сіле, а не на справядлівасьці. Зьмена гэтага трактату мусіць прыйсьці, усё роўна ці на падставе дабравольнага паразуменьня ці сілы.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

Аб гаспадарцы.

Зьмена ў законе аб ліцытацыях.

У „Dzienniku Ustaw" № 15 с. г. пабачыла сьвет „Устава з дня 25 лютага 1932 г. аб зьмене некаторых прадпісаньняў уставы судова-цывільнага пастуланьня з 1864 г.," якая абавязвала дагэтуль і на ўсіх беларускіх землях пад Польшчай. Гэта новая ўстава абавязвае ў нас ад дня 29.II.1932 г. і датыча перадусім забэсьпячэньня ад экзэкуцыі (прымусовай прадажы) гэтак званых *сродкаў прадукцыі* і азначэньня цаны пры паўторных ліцытацыях.

Як сродкі прадукцыі ў земляробскай гаспадарцы разумеецца жывы і нежывы інвэнтар, а так-жа запасы збожжа, бульбы і інш. акопнінаў, сена і саломы, патрэбных дзеля ўтрыманьня людзей і працоўнай жывёлы да найбліжэйшага жніва. Жывы інвэнтар гаспадаркі, гэта ягоная жывёла, а нежывы — ўсякая гаспадарчая снасьць і машыны.

Вось-жа, паводле новай уставы з дня 25.II.1932 г. ўсе гэтыя *сродкі прадукцыі ні ў якім выпадку* ня могуць быць прададзены на ліцытацыі асобна ад самай гаспадаркі (зямлі і будынкаў), калі гэтыя сродкі належаць да ўласьніка гэтае-ж гаспадаркі. — Далей, калі ліцытацыя на прадметы вышэй незначаныя ў назначаны час не адбылася з прычыны няпрысутнасьці ліцытантаў, прысутныя крэдытары могуць жадаць паўторнай ліцытацыі, або непрададзеныя прадметы ўзяць для сябе, але па цане ня ніжэйшай ад тэй, якая была ўстаноўлена пры апісаньні. Пры паўторнай ліцытацыі нельга прадаваць ліцытаванага прадмету за цану ніжэйшую, чымся палавіна цаны ўстаноўленай пры апісаньні. Ацэнка рухомых прадметаў адбываецца пры самай-жа опісі; праводзіць яе сэквэстратар у паразуменьні з даўжнікам. Калі-б гэтыя асобы не маглі дагаварыцца аб цане, даўжнік мае права дамагацца, каб ацэнку зрабілі знаўцы, але кошты такой ацэнкі кладуцца цалкам на даўжніка.

Асобна стаіць справа ліцытацыі прадметаў нярухомых, або проста — нярухомасьцяў (зямля, будынкі, лес, сад), асабліва што да паўторнай на іх ліцытацыі, якая адбываецца без паўторнай ацэнкі і на якой гэтыя нярухомасьці ня могуць быць прададзены за цану ніжэйшую дзьвюх трацін першай ацэнкі. Паўторная ліцытацыя на нярухомасьць ня можа адбыцца раней месяца пасьля 1-шай ліцытацыі, калі ейная вартасьць не перавышае 1.000 зл., не раней 2-х месяцаў, калі вартасьць нярухомасьці перавышае 1.000 зл. і не раней 3-х месяцаў, калі гэта вартасьць перавышае 20.000 зл.

інж. А. К.

Пару слоў аб сэктанстве.

Маючы шырокую сувязь з беларускай вёскай, мы атрымліваем з сяла весткі між іншымі і аб сэктантах. З гэтых вестак даведваемся, што апошнімі часамі сэктанства пачало пашырацца і сярод каталіцкай беларускай людна́сьці. Гэтыя весткі падахвочваюць да ведама, мы ня раз ужо пісалі аб шкоднасьці сэктанства ў справе як народнай, так і сацыяльнай, перасьцерагаючы беларускае сялянства прад гэтай маральнай гангрэнай.

Да гэтай пары сэктанскія прапаведнікі былі цярплівыя і пакорныя, а цяпер пачынаюць ужо і гразіць сваім праціўнікам „зьвяртаньнем да ўраду шляхам адміністрацыі."

Гэтымі днямі наша рэдакцыя атрымала пісьмо ад п. Б., які дамагаецца пад пагрозай, што „зьвернецца да ўраду шляхам адміністрацыі," калі мы не надрукуем яго пісьма, у каторым ён бароніць сэктанства, кідаючы цень забабоннасьці на праваслаўе.

Вось з гэтага мейсца адказваем п. Б., што Вашага пісьма, баронячага і прапагуючага сэктанства ня зьмесьцім, гэты шлях барацьбы — „да ўраду шляхам адміністрацыі" нас не застрашвае, як не застрашвае і само сэктанства. Беларускі народ шмат ужо перажыў усялякіх бед, перацерпіць і бяду сучасную. Прыйдзе час і беларускі народны арганізм адкіне ад сябе ўсё ліхое разам і з сэктанствам. Мы ў гэта верым і да гэтага імкнёмся.

р.

Да нас пішуць.

НЯМА ЗЛОГА, КАБ НЯ ВЫЙШЛА НА ДОБРАЕ.

Харкі, Пастаўскага пав. У нас цяпер узмаглася агітацыя сярод моладзі, каб зацягнуць яе ў польскія арганізацыі. Нагаварвае да сябе нашу моладзь „Стоважышэне Млодзежы Вейскай,“ заклікаюць моладзь і ў арганізацыю „Стшэлца,“ а апошнімі часамі пачалі арганізаваць і „Страж агнёвую.“ Моладзь наша ўзварушана агітацыяй да арганізацыі дадумалася, што ёй трэба зрабіць і заснавала свой гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Беларусы, прабуджайцеся і арганізуйцеся ў сям'ю народную каля Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, каб працаваць над пашырэньнем асьветы на беларускай вёсцы. Паступак нашай моладзі няхай будзе прыкладам другім.

Харкоўскі.

ТРЭБА ЗРАЗУМЕНЬНЯ.

Шальціны, Браслаўскага пав. У пачатку с. г. паўстаў у нас гурток Б. І. Г. і К. Патрэба сваей беларускай арганізацыі адчувалася ўжо даўно. Перашкодай дзеля зрэалізаваньня гэнае патрэбы было слабое ўсьведамленьне грамадзкае нашай і суседніх вёсак.

Тады, калі Беларусам у нас назаве сябе кожны, за выняткам толькі здэгенэраваных падлізьнікаў панскіх, якія засіляюць „стшэльца“ ці цёмнай, як восеньняя ноч, дэвоткі — то да дзейнай працы на грамадзкай ніве трудна было знайсьці людзей. Кожны выгаварываўся тым, што ён з усей ахвотай запішыцца ў сябры беларускай арганізацыі, аднак быць закладчыкам, старшынёю, увайсьці ў Урад лічыў сабе не пад сілу. У нейкай меры — слушна. У нас на вёсцы сьведамай беларускай інтэлігенцыі бадай што зусім няма.

Вось тут і няшчасьце беларускай вёскі. У сяньняшні час нябывалага заняпаду на гэтым цяжкім шляху імкненьня да нацыянальнага і социяльнага адраджэньня яна пакінена сама сабе. Тым больш тады цешыць зьявішча, што вёска сама—сваімі сіламі цярэбіць сабе шлях да лепшага заўтра. Не азначае гэта, што яна абыйдзецца бяз помачы з боку сваей інтэлігенцыі. Інтэлігенцыя ў гарадох — на вёсцы сьмяротная глуш... Толькі-ж дзеля ператрываньня сяньняшніх выняткава цяжкіх абставін народнага жыцьця, вёсцы нашай сілы хопе. Бо-ж ня гэтулькі яна ператрывала. Толькі каб хутчэй мінуў гэты час! Хутчэй каб новыя кадры беларускай інтэлігенцыі прышлі дасловна ў вёску і шпарчэй пасунулі родную справу.

Чорнаю, мазалістай рукою ад плуга і касы, ня бачыўшы роднае школы, з ведаю, якую змаглі здабыць на цяжкай дарозе самаадукацыі становяцца верныя сыны і дочкі беларускай вёскі да працы на прасьветнай ніве.

Тым больш годнае накляймаваньня тое становішча старэйшых сялян нашай вёскі (на шчасьце—вельмі ня многіх), якія, нармальна рэч беручы, мусілі-б быць сэнатам роднай вёсцы — а ня шкоднікамі яе інтарэсаў і тормазам яе поступу. Бо і як інакш назваць паступак старэйшага і аднаго з паважнейшых грамадзян нашае вёскі, Франціша Марцілёнка, калі ён, пачуўшы аб залажэньні Гуртка Б. І. Г. і К, гавора з думаю годнай лепшай справы: „Няма бацькоў у гэтых дзяцей, што запісываюцца ў гэты гурток! Зачым мой сын гэтага ня зробе?“

Нешчасьлівы сын! Каб так думалі ўсе лепшыя сыны працоўнага люду, дык і сяньня йшчэ ярмо прыгону і панскі бізун віселі-б над тваім каркам. А можа затое так гаворыш, суседзе, што багата табе жывецца і хутар маеш вялікі — а ўсё другое табе не баліць?...

Наша просьба да вас, суседзе: не замінайце вам у працы! І калі ня можаце памагчы нам радай жыцьцёвага дазнаньня — то хоць не выстаўляйце на ганьбу свае сівыя валасы!

Шальцінаўскі.

НАШЫ „ПАНЕНКІ.“

Будслаў, Вялейскага пав. Не хацелася-б гаварыць аб выпадках, каторыя яскрава сьведчаць аб цяперашняй цемнацеі ўмысловай зьялчэласьці Будслаўскіх дзяўчат, якія залічаюць сябе да „інтэлігенцыі.“ Але дагэтуляшняя добрая слава нашай ваколіцы не пазваляе маўчаць.

Мясцовыя хлопцы, карыстаючы з прыезду вучнёўскае моладзі на Вялікодныя сьвяты, пастанавілі зладзіць беларускі спэктакль-вечарыну — даход з якой меўся пайсьці на адбудову тутэйшага касьцёла. Да гэтай справы вельмі прыхільна адвёсься і тутэйшы пробашч, мінаючы арганістага, каторы, з зусім несьвядомай баязьлівасьцю, заўсёды далікатна адмаўляецца ад чыннага ўдзелу ў культурных пачынаньнях нашае моладзі.

І вось, у той час, калі хлопцы ўзяліся за гэтую справу шчыра і з ахвотаю, дык аб дзяўчатах гэтага нельга сказаць. Прычынай гэтага зьяўляецца тое, што дзяўчаты баяцца страціць ласку ў мясцовых вайсковых, з якімі яны ахвотна бяруць удзел у польскіх прадстаўленьнях, ня маючых нічога супольнага з нашым жыцьцём.

Гэтакае пастуваньне дзяўчат неразрыўна вяжацца з усёй той дэмаралізацыяй, якая ўжо пару гадоў таму назад пачала праніканць у асяродзьдзе нашых „паненак.“ Выяўляецца яна ў тым, што апошнія ня стыдаюцца адкрыта хадзіць па кнайпах, піць гарэлку і наагул прымаць удзел у розных інпрэзах, гдзе маюць магчымасьць пабачыць „niespodziankę,“ аб каторай пасьля ведае ўсё ваколічнае насельніцтва.

Дык адумайцеся, дзяўчаткі, і ня лезьце ў балота, ня будзьце скулай будслаўскае моладзі, а вазьмецеся лепш да працы, каторая мае на мэце наша агульнае дабро. Няхай словы нашага песьняра Я. Купалы будуць нашым клічам:

Пара у рукі браць паходні,
Ісьці ў народ, ноч рассьвятляць,
Бо што ня возьмеце сягоньня,
Таго і заўтра вам ня ўзяць!

Наглядчык.

KRYCHU I AB NAŠAJ STARONCY.

Krasnaje, Maładečanskaha paw. Čytajučy „B. Krynicu“ spatykajem wiestki z usich kutkoŭ Zach. Biełarusi, a z našaj miajscowaści, dyk nichto j nie adzawiecca. Wyhladaje, što byccam u nas i biełarusaŭ niama. Ale-ž nie! U nas usie biełarusy, tolki niejkija zapudžanyja i byccam stydajucca sami siabie.

Dyk woś ja pastanawiŭ pisać ab našaj staroncy ŭ „B. Krynicu,“ kab dać wiedać i ab nas.

Ciažka ciapier u nas žywiecca sielaninu-ziemlarobu. Ekanamičny zaniapad pahłyblaje zaniapad i duchowy. Redka dzie ciapier spatkaješ u našaj wioscy knižku abo hazetu. Narod pahłyblajecca ŭ ciemru i tolki žalicca na kiepskija časy. Moładź naša prosta dzičeje. Kali dzie złowić załatoŭku, adno znaje—kupić harełki i napicca.

Nia lepš u nas i ŭ žyćci relihijnym. Duchaŭnikoŭ u nas swaich niama, bo prawasłaŭnyja świaščeńniki—maskali, a katalickija ksiandzy—palaki. Dziela hetaha poŭny zaniapad relihijny. Duchaŭniki zhubili ŭžo daŭno na naš narod usialaki ŭpłyŭ i ciapier rola ich dajšła da aficyjalnych tolki čynoŭnikaŭ „cywilnaha stanu,“ za čynnašci katoryja wiedajuć adno, kab jak daražej uziać zapłatu. Z pryčyny hetaj wielmi papularyzujecca ŭ nas sektanstwa, jakoje pašyraje swaju dziejnaść biaz nijakich pieraškod.

Braty biełarusy z pad Krasnaha. Apamiatajmasia, bo my jdziom pa pachiłaj płoščy ŭ prapaść. Biaremasia za aświetu: —wypiswajma swaje rodnyja biełaruskija hazety i knižki, čytajma ich i druhim dawajma. Zakładajma swaje biełaruskija arhanizacyi, pry arhanizacyjach — bibliateki-čytalni. Ładźma swaje pradstaŭleńni, arhanizujma pasiarod moładzi chory i śpiawajma swaje pryhožyja pieśni. Słowam, zmahajmasia za žyćcio, uciakajučy ad śmierci.

Dyk da pracy!

Biełarus z-pad Krasnaha.

З Вільні.

Разводзьдзе сёлета пачалося амаль на тры тыдні раней ў параўнаньні з леташнім годам. Вяльля у дольнай сваей часьці ў Вільні рухнула ўжо ў суботу 2 г. м. Агулам сялетняе разводзьдзе меншае ад леташняга, але выпадкі заліваньня дамоў вадой усё-ж здараліся. Чынна выступала пры гэтым мясцовая пажарная стража і вайсковыя аддзелы сапэраў. Ахвяр у людзях ад паводкі дагэтуль ня было.

З правінцыі аб большых ледзяных заторах на Вяльлі паведамляюць з Міхалішак і з Неманчына, дзе ушкоджаны былі нават масты.

— Таксама паважныя разьмеры прыняла паводка ў Лідчыне і ў Слонімшчыне.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Закладайце гурткі Беларускага

Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

Наша пошта.

Бублевічу. Аб выезьдзе заграніцу нічога дарадзіць ня можам. Лепш трэба змагацца з цемрай, якая родзіць зло, бо яна можа таксама згубіць і ўвесь народ, як цяпер губіць Вас цемра Вашага бацькі. Бяз любові ў хрысьціянскім разуменьні шчасьця людзі не знойдуць. Калі людзі пачнуць любіць адны другіх як самы сябе — тады такой паняверкі ня будзе. Дык трэба прасьвячацца і багаціць сэрцы ў любоў хрысьціянскую, каб даць мейсца справядлівасьці.

Шальцінскаму. Дзякуем, друкуем.

Харкаўскаму. Дзякуем, карыстаем, пішыце больш.

Медчаху. Да друку не падходзіць.

Брую. Такога „спраставаньня“ ня зьмесьцім, бо яно нічога не „прастуе,“ а толькі агітуе за сэктанства.

Сьвінобурко. Сьпярша трэба праз акружны суд сьцьвердзіць, што Вы дачка памёршага, а тады з тым дакумантам можна дамагацца па бацьку спадчыны. Гэту справу перадайце адвакату, бо самі не дасьцё рады.

Лазавіку. З карэспандэнцыі карыстаем, пішыце больш. Вэксалі ўжо старыя, дык падайце ў суд звычайнай позвай далучыўшы да справы гэтыя вэксалі.

Купрыновічу. Атрымалі, дзякуем. Залажыць гурток Бел. Інст. Гасп. і Культ. вельмі лёгка, пасылаем Вам інструкцыю. Як заложыце гурток, Цэнтраля дасьць Вам для бібліятэкі пэўны лік кніжак, найлепш было-б, каб хто будучы ад Вас у Вільні зайшоў да нас і гэтыя кніжкі ўзяў, бо перасылка дорага каштуе.

Дзядзька Гаўрыла. Можаце пісаць і на машыне, як Вам лепш. Прысылайце свой праект нагародай і далейшыя гутаркі.

Ярмалковічу. Зьмяшчаем у гэтым нумары, пішыце аб гэтых справах часьцей.

Гэтым падаецца да ведама, што 12 красавіка с.г. а гадз. 11 дня мае адбыцца

АГУЛЬНЫ СХОД
Таварыства Беларускае Школы

ў памешканьні Галоўнае Управы пры Кіеўскай вуліцы 4 – 24 у Вільні.

Галоўная Управа
Т.ва Беларускае Школы.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „Pahonia“: Wilnia, Zawalnaja wul. Nr. 6.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.